ўніверсітэта) : матэрыялы Міжнар. навук. канф., Мінск, 26 верас. 2014 г. / Беларус. дзярж. пед. ун-т ; рэдкал.: В. Д. Старычонак, І. М. Гоўзіч, Н. В. Заяц ; адк. рэд. В. Д. Старычонак. – Мінск, 2014. – С. 185–189.

*Т. М. Тарасава (Беларусь)*

# ВЕРЛІБРЫ МАКСІМА ТАНКА

Максім Танк – геніяльны паэт, яркі талент, мудры чалавек, ён заўсёды застанецца ў беларускай літаратуры зоркай першай велічыні. Яго творчасць – адна вялікая кніга, у якой увасоблены і мінулае, і сучаснасць, і будучыня. Рыгор Барадулін неяк заўважыў: «Колькі кніг у Максіма Танка? Іх шмат. І ў кожнай – ён новы, падобны і непадобны да сябе ранейшага» [1].

Талент паэзіі Максіма Танка найбольш ярка праявіўся ў верлібрах – па-філасофску заглыбленых, пачуццёва арганізаваных вершах-развагах, вершах-роздумах. Танкаўскі верлібр – гэта сплаў думкі і пачуцця, натуральнае выяўленне чалавечай душы, гэта асацыятыўны і нечаканы дыялог з чытачом, гэта тонкі пачуццёвы верш-абразок.

Верлібрам (свабодным вершам) тэарэтыкі-літаратуразнаўцы называюць верш, які не мае метра і рыфмы і ад прозы адрозніваецца наяўнасцю графічнага радка (у пісьмовым тэксце) і напеўным тонам (у вусным выказванні). Безумоўна, паўстае пытанне: «Верлібр – гэта паэзія ці проза?» Гэткая пастаноўка праблемы, на думку Ю. Лотмана, не зусім правільная, бо ў такім выпадку верлібр разглядаецца як механічная сума элементаў па-за яго паэтычным кантэкстам. І атрымліваецца, што творы, напісаныя свабодным вершам і вырваныя з кантэксту вершаваныя радкі, могуць успрымацца як проза.

Верлібр прыйшоў у беларускую літаратуру з заходнееўрапейскай культуры. На Беларусі да верлібра звярнуліся М. Багдановіч («...Я хацеў бы спаткацца з Вамі на вуліцы»), у 20-я гады XX ст. В. Ластоўскі. У СССР да хрушчоўскай «адлігі» свабодны верш паяўляўся рэдка, ён быў «не рэкамендаваны», а ў другой палове XX ст. верлібр найчасцей сустракаецца ў творчасці А. Лойкі, Я. Сіпакова, П. Панчанкі, Ю. Голуба, Н. Загорскай, А. Вярцінскага і інш.

Асноўным відам верша свабодны верш стаў у Максіма Танка. Верлібр найчасцей ужываўся паэтам у медытатыўных творах і філасофскіх, аўтар прывучаў чытача да ўмоўна-асацыятыўнай вобразнасці, да адсутнасці рытмікі і рыфмы. Найбольш вядомымі танкаўскімі верлібрамі сталі «Рукі маці», «Мыццё бабкі Улляны», «Перапіска з зямлёй», «Гравюры Скарыны», «Просьба аб дараванні».

Паэт-мадэрніст і крытык Томас Эліёт калісьці заўважыў: «Работа над верлібрам з'яўляецца нашмат цяжэйшай, чым над звычайным вершам» (Эсэ «The Music of Poetry», 1942). Верлібр з'явіўся як форма для выяўлення найперш філасофскага зместу, заглыбленага ў быццё, у духоўна-душэўныя глыбіні. Але ў кожнай нацыянальнай літаратурнай традыцыі свабодны верш мае свае адметнасці, абумоўленыя этнічнымі асаблівасцямі, менталітэтам нацыі, яе культурнымі скарбамі, індывідуальнасцю мастака слова. Паэтыка верлібра дае паэту максімальную творчую свабоду: «Дрэвы паміраюць, / Калі перастаюць пазнаваць / Змены года / І не адгукаюцца рэхам; / Вада – калі забывае, / Куды ёй плыць, / І нікому не спатольвае смагі; / Зямля – калі перастае / Радзіць хлеб / І быць калыскай песняў; / Чалавек – калі страчвае здольнасць / Здзіўляцца і захапляцца / Жыццём» [2, с. 214].

Філасофская паэтычная думка ў гэтым верлібры сканцэнтравана ў апошнім трохрадкоўі, менавіта чалавек становіцца аб'ектам аўтарскага роздуму. Меланхалічна-трагічны настрой радкоў зададзены першым поўным графічна аформленым сказам, наступныя няпоўныя сказы працягваюць гэтую інтанацыю. «Паўторы «па вертыкалі»« (В. Рагойша) выклікаюць так званае разняволенне паэтычнага радка.

Галоўная тэма танкаўскіх верлібраў – Радзіма (яе гісторыя ў легендах і паданнях, песнях, казках, маляўнічая прырода, працавіты народ…) Вось адзін з найбольш патрыятычных свабодных вершаў паэта: «Аслепшы, / Яшчэ можаш з кульбакай / Дарогу да дому знайсці. / Аглухшы, / Яшчэ будзеш чуць, / Скрып дзвярэй сваёй хаты. / Анямеўшы, / З сябрамі бяседу весці / Ва ўспамінах. / Толькі страціўшы Радзіму, / Будзеш як камень / Сляпы, і глухі, і нямы» [3, с. 51–52].

Адметнасць танкаўскага верлібра абумоўлена ментальнасцю беларусаў, нацыянальнай культурай, яе фальклорнай традыцыяй. Паэт быў маштабным ва ўсім: тэмах, матывах, ідэях, пошуках новых форм вершаскладання. Верлібр Максіма Танка мае ярка выражаныя нацыянальныя канатацыі, якія абумоўлены звышзадачай паэта: у актуальнай форме па-філасофску глыбока і эмацыйна кранальна раскрыць характар беларускага народа, яго мінулае, духоўную спадчыну, менталітэт, адметнасці характару.

Максім Танк смела спалучае ў сваіх верлібрах біблейскі падтэкст з беларускімі рэаліямі («Мой каўчэг»), часта згадвае агульнаславянскую і беларускую міфалогію («Тут Беларусь была»), этнаграфічна-побытавую дэталь («Барана») і нацыянальныя фальклорныя вобразы («Ёсць на маёй Радзіме…»). Яго свабодны верш насычаны шматлікімі рэмінісцэнцыямі, фальклорнымі, міфалагічнымі, біблейскімі, якія адлюстроўваюць духоўныя першакаштоўнасці народа. Часам мы маем арыгінальнае аўтарскае паэтычнае тлумачэнне фразеалагізмаў, біблейскіх сюжэтаў, прыказак, прымавак. Так, своеасаблівая іранічная палеміка Максіма Танка з катэгарычнымі народнымі выказваннямі раскрываецца ў вершы «Кажуць…»: «Кажуць: / «Цішэй едзеш – далей будзеш». / Мо праверыць? / «А за кукіш круп не купіш». / А я думаў? / «Праўда

люба, хоць і груба». / Ці заўсёды? / «Папрацуеш – смак пачуеш». / Мо і праўда? / Кажуць: / «Смерць вянчае славай». / Пачакаю?» [2, с. 249].

Агульнавядомыя ўстойлівыя выразы, уключаныя ў структуру свабоднага верша, набываюць гумарыстычнае гучанне ў беларускага паэта.

Максім Танк арганічна спалучыў у верлібры агульнафіласофскую думку, агульнагуманістычную праблематыку з нацыянальнымі культурна-побытавымі асаблівасцямі беларусаў. Яркія фальклорна-паэтычныя вобразы падкрэсліваюць першакаштоўнасці бацькоўскай зямлі, яе духоўнай культуры.

Глыбока ўвасоблены ў танкаўскім верлібры вобраз маці: «Не знаю, / Ці ёсць жыццё / На нейкіх зорках. / Я знаў толькі адну зорку – / Пяцікрылую далонь маці, / На якой выраслі / Мы, наш хлеб, нашы песні. / Святло якой / Вечна струменіць» [2, с. 384].

Яркая метафара «пяцікрылая далонь маці» неверагодна пашырае сэнсавую перспектыву, арганічна выяўляе сплаў глыбокай думкі і тонкага пачуцця.

Адметнасць свабодных вершаў Максіма Танка найперш у тым, што ў іх больш схаванага, чым выказанага. Многія з іх пазбаўлены пафасу, не навязваюць чытачу аўтарскую думку, не прэтэндуюць на выключнасць уласнага бачання свету. Так, у верлібры пра шыбы старой камяніцы знешне слаба выяўлена лагічная сувязь паміж асобнымі элементамі тэксту, яе павінен убачыць чытач, які самастойна рэканструюе складаную прастору верша, узнаўляе сувязь паміж яго элементамі: «Асцярожна выцірайце шыбы, / Каб з ценям дыму / Пажараў вайны / Не сцерці і ценяў / Вам блізкіх людзей, / Якія апошні раз / Некалі ў гэтыя шыбы глядзелі» [4, с. 141].

Танкаўскі верлібр – унікальная з'ява беларускага вершаскладання і еўрапейскай паэтычнай традыцыі ў яе жаданні пераадолець спрадвечнае супрацьстаянне паэзіі і прозы. Свабодны верш Максіма Танка з яго скандэнсаванасцю філасофскай думкі і глыбокага лірычнага перажывання сведчыць аб плённым развіцці верлібрычнай сістэмы вершаскладання ў сучасным літаратурным працэсе Беларусі.

## Літаратура


1. Барадулін Рыгор [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://www.medioq.com/BY/Minsk/569517903179556/%D0%9C%D0%B0%D1%81%D1%82%D0%B0%D1%86%D0%BA%D0%B0%D1%8F-%D0 %BB%D1%96%D1%82%D0%B0%D1%80%D0%B0%D1%82%D1%83%D1%80%D0%B0. – Дата доступу: 15.10.2022.
2. *Танк, М.* Збор твораў : у 13 т. / М. Танк. – Мінск : Беларус. навука, 2006–2012. – Т. 4 : Вершы (1964–1972). – 2007. – 384 с.
3. *Танк, М.* Збор твораў : у 13 т. / М. Танк. – Мінск : Беларус. навука, 2006–2012. – Т. 5 : Вершы (1972–1982). – 2008. – 448 с.
4. *Танк, М.* Мне пару крыл дало юнацтва : выбр. лірыка / М. Танк. – Мінск : Беларусь, 2003. – 495 с.